**Аналіз верша Якуба Коласа “Ручэй”**

**М. Л. Мацкевіч,**
настаўніца беларускай мовы і літаратуры
першай катэгорыі
СШ № 2 г.Сянно Віцебскай вобласці

**Тэма.** Якуб Колас “Ручэй”.

**Напрыканцы ўрока вучні будуць ведаць:**
змест верша, навучацца яго выразна чытаць, умець знаходзіць вобразна-выяўленчыя сродкі, вызначаць іх ролю, адказваць на пытанні, параўноўваць паказ аднолькавай з’явы прыроды ў паэтычным творы Якуба Коласа “Ручэй” і празаічным творы Т. Хадкевіча “Крынічка”, пашыраць свой слоўнікавы запас.

**Задачы настаўніка па выхаванні і развіцці вучняў:**
спрыяць фарміраванню эмацыянальна-эстэтычных уяўленняў сродкамі літаратуры і музыкі;
садзейнічаць у выхаванні пачуцця замілавання роднай прыродай, беражлівых адносін да ўсяго навакольнага.

**Тып урока:** урок вывучэння новага матэрыялу.

**Абсталяванне:** Беларуская літаратура: вучэб. дапам. для 7-га класа агульнаадукац. устаноў з бел. і рус. мовамі навучэння /М.А. Лазарук, Т.У. Логінава – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2010;
партрэты Якуба Коласа, Т. Хадкевіча, запіс песні “Ручэй” у выкананні ансамбля “Песняры”, фанаграма плёскату ручая, слайды “Родныя краявіды”. Выстава кніг Т. Хадкевіча.

## Ход урока

*Для нас прыроды болей мілай, чым беларуская няма.*

Н.Гілевіч

**I. Арганізацыйна-матывацыйны этап**

**1. Метад “Вітанне”**

- Я вітаю тых, хто сёння з задавальненнем ішоў у школу;
хто трывожыўся з розных прычын;
тых, у каго добры настрой;
тых, хто любіць вучыцца.

**2. Паведамленне тэмы, пастаноўка навучальных задач**

А) Матывацыя

- Настаўнік чытае верш Якуба Коласа "Многа слаўненькіх куточкаў…"

*Многа слаўненькіх куточкаў*
*Ёсць у нашым краі,*
*Дзе пад гоман ручаёчкаў,*
*Пад шум дрэў у гаі*
*Рой журботных дум пакінеш,*
*Дзе няма трывогі,*
*Дзе душою адпачынеш,*
*Змучаны з дарогі;*

*Дзе прыемны ветрык млее,*
*Збажыну калыша,*
*Дзе пакоем-згодай вее,*
*Дзе ўсё шчасцем дыша.*

- Як вы лічыце, аб чым пойдзе гутарка на сённяшнім уроку?

*(Адказы вучняў)*

-Сёння на ўроку мы пазнаёмімся з вершам Я.Коласа "Ручэй".

А зараз давайце вызначым мэты і задачы ўрока.

(*Адказы вучняў:* - засвоіць змест твора,
- навучыцца выразна чытаць верш,
- вызначыць вобразна-выяўленчыя сродкі, іх ролю,
- ведаць галоўную думку твора,
- вучыцца выказваць свае думкі і пачуцці,
- вучыцца любіць прыроду, беражліва адносіцца да ўсяго навакольнага).

А яшчэ - параўнаць паказ аднолькавай з'явы прыроды ў паэтычным творы Якуба Коласа "Ручэй" і празаічным творы Т.Хадкевіча "Крынічка", з якім вы павінны былі пазнаёміцца дома.

*(Зварот да маршрутнага ліста)*

**II. Аперацыйна-выканаўчы этап**

**1. Выразнае чытанне верша на памяць настаўнікам.**

- Услухайцеся ў паэтычны тэкст, асэнсуйце яго на ўзроўні пачуццяў.

**2. Першапачатковае ўспрыманне твора вучнямі.**

- Ці спадабаўся вам твор? Чаму?

А) Слоўнае маляванне

- Апішыце, якія канкрэтныя малюнкі паўсталі перад вамі пры чытанні верша (схіленая над вадою вярба; пышнаверхія кусты, якія глядзяцца, як у люстэрка, у ваду; зорка, што ўпотайкі, ноччу глядзіцца ў ручэй; схіленая над вадою трава, падобная на брыжы; і, безумоўна, сам срэбразвонны ручэй).

Б) выразнае чытанне верша вучнямі "пра сябе"

В) выразнае чытанне верша ўслых.

**3. Слоўнікавая работа (тлумачэнне незразумелых слоў)**

**4. Аналіз тэксту верша. Адказы на пытанні**

- Хто галоўны герой твора?
- Якім паказаны гэты ручэй? *(Вясёлым, гаманкім, бесклапотным, пявучым, жывым).*

- Як вы думаеце, ці падабаецца паэту ручаёк? Якім бачыць ручаёк паэт? Якім бачыце яго вы?

**5. Вызначэнне сродкаў мастацкай выразнасці**

(Дадатак. Маршрутны ліст. Заданне 1).

А) Праца ў парах.

- Слухаючы верш "Ручэй", мы ўяўляем тое, пра што гаворыць аўтар. З дапамогай якіх вобразна-выяўленчых сродкаў яму ўдалося гэта зрабіць? *(Эпітэты, метафары, параўнанне.)*

-Вызначце ў тэксце верша:

1-ы рад – эпітэты (выразнасць, паэтычнасць); параўнанне (дае ацэнку).

2-і рад – метафары (вобразнасць, маляўнічасць).

3-і рад – параўнанне (дае ацэнку), эпітэты (выразнасць, паэтычнасць)

- Што надаюць твору сродкі мастацкай выразнасці?

Метафары надаюць …

Эпітэты надаюць …

Параўнанні надаюць …

(Эпітэты: срэбразвонны, гучны, несціханы, густы, пышны.

Метафары: глядзяцца кусты, падыходзіць мурог, зорка кіне зрок, хмурынка зазірне, схіляе трава, ручэй дрыжыць,бубніць, пяе.

Параўнанне: як матулька, вярба).

Б) Праверка задання, выстаўленне балаў у ацэначную табліцу.

**Фізкультхвілінка**

– Папрацавалі мы старанна, а цяпер можна і адпачыць ( уключаецца фанаграма плёскату ручая).

– Паглядзіце на дошку, на ёй запісаны дзеясловы з верша: шуміць, грыміць, хіліць, глядзяцца, абступаюць, кіне (зрок), зазірне, схіляе, дрыжыць, заскоцыць, абаўе, бубніць, слухаць, адпачынеш.

Паспрабуйце перадаць жэстамі гэтыя дзеянні адзін аднаму. Адпачылі? Малайцы.

– Перачытаем верш яшчэ раз уголас. Пастарайцеся з дапамогай інтанацыі перадаць эмацыянальную выразнасць твора. *(Вучань чытае.)*

– А цяпер вызначым асноўную думку – ідэю твора. *(Аўтар хацеў паказаць прыгажосць ручая і карцін навакольнай прыроды, паэтычную адухоўленасць гэтых вобразаў, замілаванне гэтай прыгажосцю.)*

**6. Верш Якуба Коласа ў музыцы**

- Пры дапамозе якога  яшчэ віду мастацтва можна перадаць змест гэтага твора? *(Адказы вучняў.)*

- Паслухайце, калі ласка, песню і адначасова палюбуйцеся роднымі краявідамі.

*(Праслухоўванне песні "Ручэй". Словы Якуба Коласа, музыка Міхаіла Чуркіна.) (На экране слайды "Родныя краявіды".)*

А) Гутарка з класам

-Ці спадабалася вам песня? Чаму?

-Якім пачуццём яна прасякнута? *(Глыбокім пачуццём бязмежнай любові да сваёй зямлі, роднай прыроды.)*

- Як вы лічыце, чаму верш Якуба Коласа пакладзены на музыку? *(Верш характарызуецца напеўнасцю, мілагучнасцю, вобразнасцю, музыкальнасцю.)*

**7. Супастаўленне твораў Якуба Коласа “Ручэй”, Т.Хадкевіча “Крынічка”**

А) Знаёмства з выставай кніг Т.Хадкевіча, з кароткімі звесткамі пра аўтара, змешчанымі ў падручніку.

- Успомнім зараз урывак з апавядання “Крынічка” Т. Хадкевіча. Што аб’ядноўвае яго з вершам Якуба Коласа і што іх адрознівае?

(Дадатак. Маршрутны ліст. Заданне 2 ).

Б) Праверка задання, вывад аб адрозненні розных відаў літаратурнай творчасці па знешніх адзнаках, па мове, па спосабах, прыёмах і сродках стварэння вобразаў, выстаўленне балаў у ацэначную табліцу.

**8. Творчая праца**

- На папярэдніх уроках мы адзначалі, што паэтам можа быць чалавек, які ўмее ў кожнай звычайнай рэчы бачыць незвычайнае. Давайце і мы на некалькі хвілін станем паэтамі. А для гэтага паспрабуем убачыць незвычайнае ў ручаі, крынічцы і перадаць свае пачуцці пры дапамозе сінквейна.

(Маршрутны ліст. Заданне 3).

**9. Афішыраванне творчых прац. (**Зачытванне невялікіх вершаў пра прыроду, Радзіму, складзеных дома.)

**10. Выстаўленне адзнак вучнямі ў ацэначную табліцу, агучванне**

**III. Падвядзенне вынікаў урока**

- Давайце з вамі адзначым, ці ўсе задачы, акрэсленыя ў пачатку ўрока, вырашаны? Так, задачы вырашаны, маршрут урока пройдзены.

Я задаволена тым, што вы неабыякавыя да нашай роднай зямлі, прыроды, любіце яе. Я спадзяюся, што гэту любоў вы пранясеце праз усё сваё жыццё і перададзіце сваім дзецям і ўнукам, як гэта зрабіў Якуб Колас. А словы Ніла Гілевіча, узятыя ў якасці эпіграфа, няхай будуць для вас жыццёвым крэдам.

**IV. Дамашняе заданне:** вывучыць верш Якуба Коласа “Ручэй” на памяць, адказаць на пытанні да твора “Крынічка”.

**Дадатак 1**

**Маршрутны ліст**

**Заданне 1.** Вызначце ў тэксце верша:

1-ы рад. **Эпітэт** – мастацкае азначэнне, якое вобразна характарызуе прадмет, з’яву. Надае мове выразнасць і паэтычнасць.

**Параўнанне** – супастаўленне двух прадметаў або з’яў на аснове іх падабенства. Паказвае жыццёвую з’яву і дае ёй ацэнку.

2-і рад. **Метафара** – вобразны выраз, у якім уласцівасці адной з’явы пераносяцца на другую, чым-небудзь падобную да першай. Надае вобразнасць, маляўнічасць.

3-і рад. **Параўнанне** – супастаўленне двух прадметаў або з’яў на аснове іх падабенства. Паказвае жыццёвую з’яву і дае ёй ацэнку.

**Эпітэт** – мастацкае азначэнне, якое вобразна характарызуе прадмет, з'яву. Надае мове выразнасць і паэтычнасць.

**Заданне 2.** Параўнайце вершаваны твор "Ручэй" Якуба Коласа з празаічным творам Т. Хадкевіча "Крынічка".

| **Крытэрыі параўнання** | **Якуб Колас "Ручэй"** | **Т.Хадкевіч "Крынічка"** |
|---|---|---|
| Знешнія адзнакі | | |
| Мова твораў | | |
| Вобразы | | |
| Інтанацыя чытання | | |
| Параўнанне з творамі музыкі і жывапісу | | |

**Заданне 3.** Ахарактарызуйце ручэй або крынічку пры дапамозе сінквейна.

1-ы радок – адзін назоўнік, які адлюстроўвае тэму;

2-і радок – два прыметнікі, якія апісваюць тэму;

3-і радок – тры дзеясловы, якія характарызуюць дзеянні па дадзенай тэме;

4-ы радок – фраза з чытырох слоў, якая выражае адносіны да апісываемага прадмета;

5-ы радок – адно слова, якое характарызуе сутнасць прадмета.

**Ацэначная табліца**

| Від дзейнасці | Максімальная колькасць балаў | Мае балы | Адзнака настаўніка |
|---|---|---|---|
| Вобразна-выяўленчыя сродкі | 3,5б. (0,5б. за кожны правільна вызначаны сродак) | | |
| Параўнанне вершаванага твора з празаічным | 2,5б. (0,5б. за кожнае правільна вызначанае параўнанне) | | |
| Сінквейн | 3б. | | |
| Верш | 1б. | | |
| Усяго | 10б. | | |